Г.А.Быстоў,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# РЕЗЕРВЫ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ МУЗЫЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

За апошнія гады шмат зроблена па паляпшэнні арганізацыі педагагічнай практыкі. І ўсё ж ёсць яшчэ ўнутраныя рэзервы. Дзве крайнасці часта назіраюцца ў педагагічнай практыцы студэнтаў: ці яны слепа прытрымліваюцца метадычных распрацовак, даных у праграме і дапаможніках да яе, ці імкнуцца да самастойнасці не ў адпаведнасці з прынцыпамі агульнай педагогікі, псіхалогіі і праграмы па музыцы. Такія крайнасці, на жаль, захоўваюцца і ў далейшай педагагічнай працы выпускнікоў. І атрымліваецца гэта часцей за ўсё таму, што мы пачынаем практыку як бы з нуля, не ўлічваючы назапашаны студэнтамі вопыт, багаж ведаў і ўменняў. Таму асаблівую ролю тут іграюць арганізацыя і змест самой педагагічнай практыкі. На ўстаноўчых канферэнцыях выключна важна абмеркаваць не толькі арганізацыйныя, але перш за ўсё актуальныя дыдактычныя, выхаваўчыя і псіхалагічныя праблемы, якія будуць стаяць у цэнтры ўвагі ў перыяд практыкі, і забяспечыць тым самым не толькі адзінства падыходу, але і павышэнне навукова-тэарэтычнага ўзроўню кіраўніцтва практыкай.

Перш за ўсё неабходна актывізаваць веды як з агульнай педагогікі і псіхалогіі, так і з методыкі музычнага выхавання. Вось чаму ў самым пачатку педагагічнай практыкі належыць правесці калёквіум. Тут вылучаюцца тры пытанні:

— веды праграмы па музыцы і асабліва дэтальна матэрыял тых класаў, у якіх студэнты будуць працаваць;

— веды псіхолага-педагагічных асаблівасцей работы са школьнікамі таго ўзросту, з якім прыдзецца мець справу;

— арыентацыя студэнтаў на творчы падыход і самастойнасць у рабоце з дзецьмі.

Неабходна кожнаму студэнту-практыканту даць магчы-

масць папрацаваць, хаця б эпізадычна, з вучнямі розных класаў і ўзроўняў здольнасцей. Гэта дасць магчымасць будучаму настаўніку музыкі пераканацца ў неабходнасці самастойнага творчага падыходу да рэалізацыі вучэбнай праграмы.

Студэнт павінен умець растлумачыць дадзены навучэнцу твор, даць аб ім патрэбную інфармацыю, расказаць аб кампазітары, жанры твора, характары выканання, аб сувязях з песняй, танцам ці маршам, дапамагчы вучню ўсвядоміць змест п'есы і інш. Важнае значэнне мае праблема зносін практыканта з вучнем. Гэта перш за ўсё ўзаемаадносіны настаўніка і вучня, якія маюць асобную эмацыянальна-зместавую афарбоўку, сумесную творчую дзейнасць, накіраваную на раскрыццё жыццёвага зместу музыкі, вопыту маральных адносін, закладзенага ў ёй. Выдзяленне гэтых бакоў паняцця "зносіны" з'яўляецца прынцыпова важным.

Вялікую цяжкасць для студэнтаў выклікае ўменне правільна паставіць вучню пытанне. Трэба навучыць практыкантаў кіравацца двума правіламі. Першае: паставіў пытанне — знай адказ на яго сам. Другое: сфармуляваў пытанне, а вучань не змог на яго адказаць. Якія "запасныя" варыянты маеш на гэты выпадак? І памятай аб тым, што іншае пытанне патрабуе шмат адказаў, у рознай ступені правільных. Важнейшыя паказчыкі плённай працы ў школе: ініцыятыва, самастойнасць, творчы падыход — не ўзнікаюць раптам, самі сабой, яны павінны абапірацца на багаж прафесійных ведаў і вопыту, на мастацка-педагагічную інтуіцыю.

У арганізацыі педагагічнай практыкі належыць больш увагі удзяляць вядзенню дзённікаў. Некаторыя студэнты адкладваюць запаўненне дзённікаў і наданне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі вучню на канец практыкі. Вопыт паказвае, што ў такіх выпадках якасць зместу гэтай дакументацыі з'яўляецца паверхневай, не раскрывае іх сутнасці. Дзённікі павінны быць сродкам тэарэтычнага асэнсавання вучэбна-выхаваўчай работы студэнтаў у ходзе практыкі і запаўняцца пасля кожнага праведзенага урока.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з практычнымі ведамі па арганізацыі і правядзенні вучэбна-выхаваўчай работы з навучэнцамі студэнтам на перыяд практыкі прапануюцца заданні па аналізе і абагульненні вопыту школы. Гэтыя заданні можна падзяліць на наступныя групы:

— вывучэнне і абагульненне педагагічнага вопыту: напрыклад, вывучыць вопыт педагогаў школы па прымяненні прыёмаў актывізацыі навучэнцаў на занятках па спецінструменце, развіцці пазнавальнай актыўнасці і самастойнай працы навучэнцаў і інш.;

— аналіз вопыту работы прадметна-метадычнай камісіі школы па спецінструменце;

— азнаямленне з методыкай работы асобных педагогаў;

— абагульненне асабістага вопыту работы студэнтаў.

Абмеркаванне і аналіз выканання гэтых заданняў ажыццяўляецца на штомесячных выніковых днях па рэалізацыі планаў практыкі, на семінарах, кансультацыях, гутарках, праводзімых кіраўнікамі педагагічнай практыкі студэнтаў.

Заключным звяном педагагічнай практыкі з'яўляюцца кантроль і ўлік падрахункаў яе, аналіз вынікаў, выяўленне нявырашаных задач, тых карэктываў, якія трэба ўнесці ў вучэбна-выхаваўчы працэс для ўстараненняў у далейшай падрыхтоўцы студэнтаў. У сувязі з гэтым студэнты V курса па заканчэнні педагагічнай практыкі, акрамя дзённіка, псіхолага-педагагічнай характарыстыкі навучэнцаў, пратакола аб правядзенні адкрытага ўрока, здаюць справаздачу аб выніках праходжання практыкі, напісанай па наступнай схеме.

— Прозвішча, імя студэнта-практыканта.

— Факультэт і спецыялізацыя.

— У якой школе (арганізацыі) праходзіў педагагічную практыку.

— Характарыстыка базы практыкі.

— Кароткія даныя аб педагогу (прозвішча, імя, імя па бацьку, адукацыя, стаж працы), у класе якога праходзіў практыку.

— Колькасны і якасны аналіз праведзеных урокаў (актыўная і пасіўная практыка).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

— Пазакласная работа.

— Удзел у пасяджэннях педсавета і прадметна-метадычных камісій.

— Якія цяжкасці зведаў у ходзе практыкі?

Вывады, прапановы па ўдасканальванні падрыхтоўкі студэнтаў да работы ў школе, арганізацыі практыкі, пажаданні на будучае абавязковыя ў гэтай справаздачы.

З мэтай павышэння эфектыўнасці праходжання педагагічнай практыкі студэнтаў належыць увесці дыферэнцыраваны залік у VII і VIII семестрах і экзамен у IX семестры, таму што ўсе студэнты атрымліваюць кваліфікацыю выкладчыкаў па спецінструменце.

**У.І.Бялоў,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## РАЗВІЦЦЁ ПРАФЕСІЙНЫХ УМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ СТУДЭНТАЎ ІІІ КУРСА Ў ЧАС ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу пяці семестраў навучання студэнты спецыялізацыі "сацыяльны педагог" засвойвалі веды па шэрагу творчых дысцыплін. Гэта — драматургія і рэжысура культурна-адпачынкавых праграм, мастацтва слова, гульнявая дзейнасць, рэкрэацыйная дзейнасць.

Атрыманыя па гэтых і іншых дысцыплінах веды студэнты замацоўваюць ў ходзе вытворчай практыкі на трэцім курсе. Практыка з'яўляецца трэнінгам для адпрацоўкі:

— уменняў ажыццяўляць пастаноўку культурна-адпачынкавых праграм;

— развіцця арганізатарскіх навыкаў;

— уменняў улічваць узроставыя асаблівасці аўдыторыі.

Базамі практыкі з'яўляюцца палацы, Дамы культуры, клубы, маладзёжныя цэнтры, кінатэатры і інш.

Як жа замацоўваюцца студэнтамі атрыманыя веды і